Poczta opłacona ryczałtem.

Адзін № каштуе 35 гр.

№ 9. 4 чэрвеня 1925 г. Год II.

Авадзень

ДВАТЫДНЕВІК САТЫРЫ, ЖАРТАУ і СЬМЕХУ.

Вядомы п і с ь м е н ь н і к Родзевіч.

...Каб ён ведаў, што тэатральнае мастацтва у беларусоў заглохла, не напісаў ба болей ніводнага сцэнічнага твору, ды мо', нат, кінуў ба зусім пісьменства...

СТАВІЎ БАНЬКІ.

...Тадора сама добра ня ведала, дзе прастыла: кашляе бедная бухі-ды бухі...

-Можа банькі паставіць?-пытае мужык.

-Хіба пастаў, Баўтручок.

-Бяда, што шклянкі німа, ды і не адна-ж патрэбна!

-А гэты гаршчочак, што зацірку вару,-здаецца не надта вялікі?

-Праўда,-казаў мужык,-і працы мне меней, чым са шклянкамі вазіцца

....

Як пацягнула жывот Тадоры у гаршчочак...





...Ды як пачала тая енчыць, у Баўтручка пацямнела у вачох; вот, здаецца, яму, што зараз усю Тадору уцягне у гаршчок...і пабег не аглядаючыся па доктара.

Доктар аж засьмяяўся, як прыйшоўшы угледзіў мучальніцу-бабу ды кіем так стукнуў па гаршку [на шчасьце гліняным] што чарапкі разьляцеліся па ўсей хаце.

-Колькі вам, паночку?-

-Паўрубля,-адказаў доктар, узяў грошы і пайшоў.

Баўтручок пачасаў патыліцу і кажа:

-Ну ці-ж у мяне не хапіла-б сілы разьбіць гаршчок?!

-Ох, уся наша бяда у тым, што мы бываем разумны па нэшчасьцю.

Сякі-такі.

Без Практыкі.

Раз дзяўчына нанялася
Ў паноў служыці
І парадак узялася
Зараз навадзіці.
Прынялась да працы ціха
Ўсё чысьціла й мыла
Ды пасуду, як наліха,
Ўсю перабіла.
Паня ўбачыўшы узялася
Адразу сварыцца:
„Як да гэтага ты, Кася,
Магла дапусьціцца!"
„А мая панічка міла!"
Кажа ей ня сьмела,-
„С-пад капусты бочку мыла-
-Аставалась цэла;
А с талеркамі-не знаю,
Штосьці ні удаецца,
Хоць часамі і ўтрымаю
Ў руках разабьецца.

С. Крап.

„Грамадзяне!

„АВАДЗЕНЬ" ёсьць безпартыйная, беларуская, люстраваная часопісь, якая не мае ніякае помачы ні субсыдзіаў са стараны.

„АВАДЗЕНЬ" трымаецца пры жыцьці толькі с падпіскі. Сваей неакуратнасьцю у перадплаце Вы самі нішчыце сваю адзіную люстраваную газэтку. Дык прысылайце грошы самі, заахвочвайце да падпіскі сваіх знаёмых!

ЖАРТЫ.

-Міхась, чаму ты ня ходзіш ужо з Зосяй?
-Але, не хаджу.
-Чаму ж гэта?
-Бо ужо ажаніўся з ею.

М.Г.

Дачка: -Мама скажы праўду-хто гэта была Ева?
Матка (паглядаючы коса на мужа):
-Гэта была жонка, каторая, таксама, ня мела у што апранущца.

„Беларус."

Жанчына да паліцыянта:
-Чаго, паночку, шукаеце пад ложкам?
-Броні, броні...
-Дык пачакайце хвілінку: ён (Бронік) зараз прыйдзе.

Лабудзь.

Спрытны мужык.

Мужык за бутэльку гарэлкі купіў у лясьніка у лесе бярозку. Адзін ён ня здужаў палажыць на воз, папрасіў лясьніка і той узяўся падсабляць, а гэтым часам наехаў пан.

Лясьнік спужаўся, аслупеў, а мужык, кінуўшы воз і лясьніка, са плачом пабег да пана і кажа:

-Панок мілы! Твой лясьнік Цэлыдзень трымае мяне лі ваза за гэту бярозку і цягне мяне да пана.

Даруй панок!

Пан засьмяяўся і ня сердзіўся ды сказаў лясьніку дамагчы узлажыць на воз.

Пасьля усяго гэтага лясьнік паставіў мужыку тры бутэлькі (вядома не пустых) за выбаўленьне перад панам.

франук.

ЗАГАДКІ.

1. Што трэба зрабіць перад тым як легчы?
2. Не кашуля-а шыта, не чалавек-а гаворыць.
3. Пад якім кустом сядзіць заяц, як дождж ідзе?

Доктар.-Мне дужа прыкра, пане Зубрчэўскі, што вы запрашаеце, ласьне, мяне. Ці ня вы толькі гэта на усіх крыжавых крычалі, што я на той сьвет кірую сваіх пацыентаў?

-Ай, доктар, дык я вас не да сябе, а да цешчы запрашаю.

Л....

oooooooooooooooooooooooooooooooo

Дзеля эканоміі.

Раз у рэчцы тапіўся жыд, пачаў крычаць: гвалт! ратуйце!

Людзі зьбегліся ды выцягнулі з вады яго. Ачунеўшы ён да ўсіх кажа:

-Ну... трэба было трохі пачакаць, а то за хутка выратавалі. Я-б сабе з вадою падплыў ба да самай хаты, а вось цяпер трэба купляць на чыгунку білет.

Г.Л.

Жывы лепшы ад нябошчыка.

Служанка да палкоўніцы:
-Ваш муж нябошчык які меў чын?
-Палкоўніка, а чаму?
-А, бо і я хутка буду палкавой дамай.
-Ты, як жа ж гэта?
-Я іду замуж за ваеннага вахмістра...
-Ну і нашла за каго ісьці!
-А што? Жывы вахмістр лепшы за нябошчыка-палкоўніка.

Г.Л.

АДАМСЦІЎ.

Прышоў пан да ксяндза ды ха- ліцца,што яго дачыста абакралі; ксёндз засьмяяўся і кажа:

-Яно і ня дзіва...Хай ба во мяне абкралі...але я разумнейшы...

Пан разсердзіўся,шапку на галаву ды за дзьверы.Хацелася яму адамсьціць за крыўду.

Наняў ён дзеля гэтага аднаго спрытнага чалавека,-той прыдумаў.

Аднаго дня,як ксёндз атпраўляў імшу ,ён прышоў у плебанію.Там ні кога на тую пару ні было.

Не трацячы ні аднэй мінуты чалавек палез у печ,выцягнуў мяса с капусты і зьеў;перад абразамі вісеў брыль |капялюх| ён узяў яго; у камодзе былі грошы-ён і іх падзяліў папалам ды й пашоў за дзьверы да касьцёлу,каб быць у споведзі.

Як ужо ён падышоў да ксяндза той пытаецца:

-Ну,якія маеш грахі?..

-Адзін грэх,ойча духоўны... Сьвіньню з капусты выгнаў...

-Дужа добра!Так заўсёгды трэба!

-Другі грэх-брыль зьняў перад абразамі.

-Дужа добра!Кожны раз зьнімаць трэба шапку,ці брыль перад абразам.

-Трэйці грэх-грошы с ксяндзом падзяліў...

-Гэта таксама ня грэх:заўсёгды трэба помніць аб ксяндзу.

-Ну,дык,ойча духоўны,больш грахоў ніякіх не маю.

Вядома,што ксёндз даў пасьля гэтага разграшэньне.

Пасьля імшы ксёндз прышоў да плебаніі і толькі тады здагадаўся, што злодзея меў у споведзі.Пашоў да судзьдзі і далажыў аб крадзежы.

Прызваў судзьдзя таго чалавека прышоў і ксёндз.

Судзьдзя пытае у падсуднага:

-Ты украў у плебаніі?..

-Я,але я сам прызнаўся айцу духоўнаму і ён хваліў,казаў„дужа добра" і нават даў разграшэньне.

....

Пасьля гэтага пан ужо с ксяндза падсьмейваўся.

Падаў Асененко.

ВЕЛЬМІ ЧУТКІ.



Начальнік крычыць на свайго пісара,хаця ён на гэта не заслужыў Той маўчыць і нічога не кажа.

-Што вы не разумееце?Вам жа ясным языком гавораць.

-Я,пане,маю вельмі тонкі слух кажа пісар,-і усё добра чую і разумею,калі мне хто ціха кажа,але нічагусенькі ня чую і не разумею калі на мяне хто крычыць.

Г.Леў.

oooooooooooooooooooooooooooooooo

У судзе.

Судзьдзя: -Вы,Сьвінарэнкаў,за зьнявагу Юркевіча і што выставілі яму хвігу павінны заплаціць тры рублі штрафу.

Сьвінарэнкаў: -Як нада,то трэба,-вымае і падае пяць рублей.

Судзьдзя: -Німа рэшты.

Сьвінарэнкаў: -Я ўжо ведаю,колькі хвіга каштуе;проша пану яшчэ рубель і проша для пана яшчэ хвігу.

В.Гаротны.

Браты і сястрыцы!прысылайце у рэдакцыю„Авадня"жарты,сьмешныя апавяданьні ды рысункі.

Заахвочвайце да выпіскі„Авадня"!

МАЛЕНЬКІ ФЕЛЬЕТОН.

-За што німа цяпер у Вільні ніводнага беларускага драматычнага гуртка?

-Гм...Валэйша браўся арганізаваць,але,як сам астаўся без „Грамадзянскага Сабраньня",дык аб гуртку ня думае.

-Ці ж апроч яго німа ужо болей здольных да арганізатарскай працы людзей?А Аляхновіч,вядомы драматург,а Шчэнсновіч-знамяніты акцёр,а... ды ці мала здольных беларусоў ёсьць у Вільні!

-Так то так...але часам недахват грошы,а часам і Влада...як,памятаеш,студэнтам не дазволіла ставіць вечарынку...

-Глупства кажаш,братку! Влада мела рацію,бо не хацела,каб пялі перад публікай гэдак„ублікаючыя" словы:Ад веку мы спалі...

-Не разумею!Што ж там у тых словах дрэннага,-спалі ну і спалі, а каму якое дзела да гэтага.

-Вось тут то і ёсьць прычына!

-У чым?

-У словах гэтых,што мы„ад веку спалі."

-Ну,напрыклад.

-Бо,відзіш,палякі ня хочуць, каб мы гарланілі са сцэны аб тым, быдта бы мы спалі ад веку і сьпім, а палякі,быдто бы,нас сьпячых пазабіралі пад сваю Владу...Бо у ва усей іхняй гісторыі ні адным словам не успамянута,што яны на сьпячых калі небудзь напалі ды і не нападалі:яны занадта адважны і гоноровы у ваенных пытаньнях.

-Ну,калі яны гэдак гоноровы, тады...тады не варта гэтага гімну пяяць,а выдумаць іншы,або зусім бяз гімну ставіць вечарыны.

-То то яно і ёсьць,што і нашы ня хочуць адказацца ад гэтага гімна.

-Яно ж так...Да забароненага кожны мае большую ахвоту.

Антось з Лепля.

oooooooooooooooooooooooooooooooooooo

Усіх тых каму пасланы былі пераводы просім аб хутчэйшай прысылцэ грошы за другі квартал.Праз неакуратнасьць сабе шкодзім.

oooooooooooooooooooooooooooooooooooo

-Ці вы чыталі у„Дзенніку Віленскім"аб„крывавым"плебісцыце у Жодзішках,дзе адзначаецца,што польская люднасьць была зьбітая (змасакрована).

-Ну як жа чытаў.А нашто пытае васпан?

-Бо я чуў,што там ніхто крыві не праліваў.

-Ну пэўна што не!

-Дык чаму гэта тут гэдак напісана?

-Ці ж ты да гэтай пары яшчэ ня ведаеш,што,чытаючы гэту газэту, трэба мець свой розум і не ўсяму таму верыць,што аб беларусах пішацца.

С.Крапіва.

oooooooooooooooooooooooooooooooo

У калідоры староства.

Сторож да сяляніна:
-Ту паліць не вольно!
-Дык я ж нічога не палю.
-пу!ну!тылько без жартуф!
-Гэта пан хіба жартуе,бо я бачыў,як пан недаўна у печцы запаліў,а я толькі падышоў прыкурыць.

С.Крапіва.

Жонка да мужа:
-Ах ты сякі-такі!Калі яшчэ раз прыдзеш позна да хаты ня вытрымаю-кінуся у возера.
-Нічога,жартуеш...Тамака і так ужо шмат гусей плавае.

Г.Л.

ДОБРЫ СПОСАБ.

Адзін абвінавачаны,баючыся быць засуджаным,просіць рады у адваката і кажа:

-Што мне рабіць,парайце...калі апраўдаюся,дык заплачу пану адвакату у тры разы болей.

Адвакат падумаў троху і кажа:

-Вам застаецца толькі прыкінуцца дурнем...Як у вас што запытаюць, дык бараніцеся вось,толькі,гэткімі словамі: ну дык што,ну вот яшчэ...

Праз колькі дзён абвінавачаны зьяўляецца у суд-судзьдзя і пытаецца:

-Вас вінавацяць у фальшаваньні дакумэнтаў?

-Ну дык што?

-Дык вы ня лічыце гэта за праступак?

-Ну во яшчэ...

-Вы...вы...мусіць вы нічога апроч гэтых слоў ня умееце сказаць?

-Ну дык што?

-Вас абвінавацілі,а вы дурака сабой паказуеце.

-Ну во яшчэ.!

Пасьля гэтага судзьдзя абярнуўся да тых,што абвінавачвалі ды й кажа:

-Ці-ж гэты дурніца можа-што падрабляць,або фальшаваць,калі ён нат гаварыць ня можа.,і прагнаў яго з суду.

Як ужо ён вышоў на вуліцу да яго падходзіць адвакат,каб атрымаць дакляраваныя грошы.

-А што ці-ж блага парадзіў я табе ?..вось і выйграў на судзе

А той у адказ спакойна:

-Ну дык што?

-Гм...я хачу атрымаць абяцаныя грошы.

-Ну во яшчэ...

- Эге,дык ты і мне прыкінуўся дурнем?

-Ну дык што?

-Ды ты са мной гавары сьмелагэта-ж ня ў судзе.

-Ну во яшчэ!..

Адвакат сцяміў,што ужо ня дойдзе з ім да ладу,плюнуў у бок і яны разышліся.

М.Малевіч.

oooooooooooooooooooooooooooooooooo

Ці Вы за АВАДНЯ плацілі,ці яшчэ не?

Халодныя бліны.

Адам штодня прыхадзіў да аднаго гаспадара у час абеда.Гаспадар яго доўга карміў.Гэта яму |гаспадару| так апрыкрыла,што ужо ня ведаў,як ад Адама атчапіцца,і што яму сказаць.

Аднаго дня,калі прыйшоў ізноў да яго Адам,ён і кажа:

-Паслухай,браток!Можа зьясі халодных бліноў?

-Чаму-ж не!З прыемнасьцю,-адказвае той.

-Ну дык,калі ласка,прыдзі заўтра:сягоньня бліны яшчэ гарачы.

Лабудзь.

Адвакаты.

Гавораць паміж сабой два адвакаты:

-Вось,я,калега,табе пахвалюся, што выйграў справу,якой і выйграць зусім ня можна.

-Гм...Як -жа ты выйграў,калі справа тая яшчэ не разглядалася?

-Грошы за яе я наперад ужо атрымаў,дык я,значыцца,ужо і выйграў,а чым самая справа скончыцца мяне зусім не цікавіць.

У фактара.

-Пане Шмуйла.Якую ты мне ўчора кухарку прыслаў?

-А сто?

-Ды яна мяне абакрала уночы.

-Дзякуйце,панічка,Богу,сто яна вас толькі абакрала,-на гэтым тыдні мі адрэкамэндавалі гэткая асоба,сто чуць не парэзала гаспадароў...

А.С.

АДГАДКІ.

1.Трэба сесьці.

2.Кніжка,3.Заяц пад мокрым кустом. |Глядзі стар.3.|

ПАСЬЛЯ ВАЙНЫ.

Калісь-то наш пан Рафаловіч
Чацьвёрку спрогшы разяжджаў
А сягоньня Янка Голуб
Зусім не так яго спаткаў.

-Дзень добры пану,шапку зьняўшы,
Янук пана прывітаў.
-Дзень добры Янка! пастарэў ты:
Цябе я ледзь ужо спазнаў!

-Ня дзіва пан,што я зьмяніўся,-
Янка пану адказаў,-
-Але во пан перамяніўся
Ды які лёгкі панок стаў!

-Што за ліха мой паночку
Ад чаго пан так зьлягчэў
Калісь-пан пенаю чацьвёрка
Цяпер адзін і не спацеў.

„Бывала с коні пена валіць,
А пан у будзе нібы сьпіш;
Калі хто пану шапку зьнімець,
Дык пан ня відзіш,ні глядзіш.

Цяпер бяда:адзін канек
І сам жа лейцы пан дзяржыць
Адзін панок-адзін канёк
І конь,як хоча,так бяжыць.

Б.Гаротны.

oooooooooooooooooooooooooooooooooooooooooooooooooooooooooooooooooooooooooooo

АБВЕСТКА.

У Маладэчне прапала бабуля.Радня вельмі занепакоена. Прыметы старой:гарбатая,бяз зубоў,зьвяглівая,уцяць можа.
Калі хто знойдзе...можа забраць яе да сябе,-будзем дзякаваць.

Радня.

ПАРАДЫ

у справе палягчэньня выплаты падаткаў.

1.Калі цяжка з грашыма,дык прадаць карэўку-будзе лягчэй.

2.Калі не пад сілу аднясьці,дык войт чалавека падашлець-паможа.

3.Ну,а калі,пасьля гэтага,зусім будзе трудна,дык бяда малая, што гаспадар скапуціцца,-нехта спадчыну заплаціць.

Арк.Б.

-Як ты малады быў цыганка варажыла,што у цябе дзяцей ня будзе.
-Дзіўны ты!У мяне і цяпер ніводнага,а толькі у жонкі дванаццацёра

На споведзі.
Поп:-Як устаеш,што перш за усё кладзеш на сябе?
Спаведнік.-Кашулю ...

Шарж.

Хацелі мы паказаць яго,нашага знамянітага даволі „дзеяча" але ён схаваўся за бутэлькай „Бачэўскага."



Мо хто адгадае?

НАША ПОЧТА.

Гр.гр.Мурашка,Карабейнік,Ромэйко,Аляхновіч,Грышкевіч і Чэрвінскі,пас.Ярэміч і сэн.Назарэўскі:ад Вас дакляраванага мы не атрымалі яшчэ.

Да чытачоў!

Паважаныя грамадзяне!Стыдна нам робіцца,як бяромся пісаць гэтыя строкі,бо на кожнай староніцы напамінаем аб тым самым,значыцца аб падпісных грашах.

Нашы грамадзяне і вухам не вядуць...І ня толькі некаторыя вясковыя не адчуваюць патрэбы плаціць за часапіс,дык нат частка гэдак званай„інтэлігенцыі"любіць чытаць на дармаўшчынку.

Гэтае замілаваньне у дармавым ёсьць найвялікшай болькай на беларускім арганізме.

Гэтая прывычка да дармавога падкапала хундамант ня толькі кніжнай літэратуры беларускай...

Хто ж захоча друкаваць свае творы,каб пасьля яны бутвелі у кнігарні?

Ахвота да дармаўшчынкі забівае нашы часапісі,якія у вялікай лічбе родзяцца ,але ўраз жа і заміраюць.

„Авадзень"пакуль жыве будзе хапацца лекаў на гэту агульную хваробу.

У № 10 мы пададзім фаміліі неакуратных,мо гэтым некаторых разбудзім з глухаты і нядбайласьці.

Наперад просім ня гневацца.

Рэдакцыя.

Да ведама чытачоў.

Беларускія кніжкі,журналы,газэты а таксама усякія канцэлярскія прылады паперу сшыткі і інш.можна купіць зусім танна у БЕЛАРУСКАЙ КНІГАРНІ,Вільня,З А В А Л Ь Н А Я 7.

Яшчэ падаткі...



Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno,Завальная 7,пры кнігарні.

ПАДПІСКА:на 3 м.1 зл.80 гр.,на паўгода-3зл.50гр.,на год-7зл. усяго. За граніцу на год-тры даляры.

Рэдактар-Выдавец А.Васілеўскі.

Літ.Мацa,вуліца Домброўскага 3,у Вільні.